Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Скажыце, доктар...

# НУ І ЯЗВА!

## Як яе «набываюць», і чаму захворванне варта своечасова лячыць

**Сёння, напэўна, няма чалавека, які не сутыкаўся б з праблемамі стрававання. Але ці ўсе болі ў вобласці страўніка звязаны з яго хваробай? Чым небяспечная язва і ці лёгка ад яе пазбавіцца? Як заражаюцца бактэрыямі хелікабактар, якія выклікаюць язву, і ці можа гэта адбывацца праз посуд і пацалунак? Навошта перад аперацыяй на галаўным мозгу рабіць фібрагастраскапію ці кансультавацца ў гастраэнтэролага? Аб праблемах, з якімі можа сутыкнуцца кожны, расказаў нейрахірург, навуковы супрацоўнік аддзялення пухлін галаўнога мозга РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчык кафедры неўралогіі і нейрахірургіі БелМАПА Гумэн ГУРБАНІДЖАД.**



— Доўгі час медыкі і вучоныя не маглі да канца разабрацца, у чым прычыны язвы страўніка і дванаццаціперснай кішкі. Лячылі не само захворванне, а змагаліся з сімптомамі. Людзі пазбаўляліся часткі страўніка ці блукаючага нерва — лічылася, што гэта дазволіць пазбегнуць рэцыдыву. Але і гэта цалкам праблему не вырашала. Толькі ў 1984 годзе ўрач і вучоны Бары Маршал на сабе даказаў, што язва страўніка мае бактэрыяльнае паходжанне і асноўная яе прычына — хелікабактар пілары, бактэрыя, якая інфікуе розныя часткі страўніка і дванаццаціперснай кішкі. Урач сам выпіў культуру бактэрыі, захварэў у дастаткова цяжкай форме і вылечыўся. Гэта стала выдатным адкрыццём, і з таго часу язву сталі лячыць па-іншаму.

***— Як зразумець, што адбылося заражэнне?***

— Рэч у тым, што мы гэтага не адчуваем. Гэта не грып, калі вірус, трапіўшы ў арганізм, выклікае павышаную тэмпературу і насмарк. Пра хелікабактар мы даведваемся, калі атрымліваем наступствы. Як вядома, саляная кіслата — гэта агрэсіўнае асяроддзе, і наш страўнік пераўляе ўсю ежу, якая ў яго трапіла. Пры гэтым сам страўнік складаецца з мышцаў, сасудаў, і мае пэўную ахову, каб не пераўляць самога сябе. Гэтай аховай з'яўляецца слізь. Дык вось хелікабактэрыі разбураюць гэты ахоўны слой: сама слізістая аказваецца ў небяспецы. Так мы атрымліваем язву страўніка. Мы гэта адчуваем як боль, але тут важна высветліць, звязаны ён менавіта з язвай страўніка ці не.

***— З чым яшчэ можа быць звязаны боль у страўніку?***

— Усе мы маем так званы блукаючы нерв. У яго доўгі шлях: ідзе з галаўнога мозга, праз сэрца, страўнік і далей. Ёсць такое паняцце, як функцыянальная дыспепсія. Мы адчуваем моцны боль у вобласці эпігастрыя, але нам ён нічым сур'ёзным не пагражае. Калі чалавек знаходзіцца ў стане моцнага стрэсу ці дэпрэсіі, нармальны сігнал, які ідзе з боку страўніка, галаўны мозг успрымае як болевы сіндром. І калі чалавек супакоіцца ці пачне прымаць антыдэпрэсанты, боль пройдзе. Пры гэтым страўнік выконваў і працягвае выконваць сваю работу паўнацэнна. Нярэдка нават самому доктару няпроста адрозніць функцыянальную дыспепсію ад іншых хвароб страўніка. Для гэтага патрабуецца прафесійная дыягностыка, кропку звычайна дапамагае паставіць фібрагастраскапія.

А ёсць стрэсавая язва, якая можа амаль не балець, але адносіцца да цяжкіх захворванняў страўнікава-кішачнага тракту. Калі яе своечасова не лячыць, усё можа скончыцца дрэнна. Стрэсавая язва бывае ў людзей, якія таксама доўга адчуваюць стрэс, часта такія пацыенты знаходзяцца ў рэанімацыі пасля складанай аперацыі, напрыклад, на галаўным мозгу. У іх можа парушацца сакрэцыя слізі ў страўніку, адпаведна разбураецца яго ахоўны слой. Стрэсавая язва, у адрозненне ад звычайнай, можа не суправаджацца моцным болем ці спазмамі, часам хворы ні на што не скардзіцца. Знаходзяць яе, калі пачынаецца страўнікавае кровацячэнне — мелена (чорны панос) ці рвота «кафейнай гушчай», падае ўзровень эрытрацытаў.

Ёсць шэраг іншых захворванняў, якія выклікаюць болі ў эпігастральнай вобласці, але яны не звязаны з язвай страўніка. Вопытны гастраэнтэролаг можа дыферынцаваць гэтыя захворванні, у прыватнасці, хваробу Крона і іншыя. Паколькі блукаючы нерв звязвае сэрца і страўнік, здараецца, што пацыент скардзіцца на боль у вобласці страўніка, а праблема знаходзіцца ў сэрцы. Часам так праяўляе сябе інфаркт міякарда. Таму з вострым болем страўніка заўсёды робяцца стандартныя абследаванні, у тым ліку здымаюць кардыяграму. Самастойна цяжка зразумець, што з табой адбываецца. На дачы баліць страўнік, чалавек пачынае прымаць ношпу, іншыя абязбольвальныя ці страўнікавыя прэпараты, а ў яго развіваецца інфаркт. Тут заўсёды неабходна звяртацца да доктара.

***— Як заражаюцца бактэрыяй хелікабактар?***

— Яна трапляе ў наш арганізм праз рот. І адбываецца гэта часта ў дзіцячым узросце. Таму першая прафілактыка — захаванне гігіены: мыць рукі, не грызці пазногці ці кончык ручкі.

***— Ці можа хелікабактар захоўвацца на посудзе і ці ёсць імавернасць заразіцца, скажам, у кафэ? Калі ў сям'і ёсць хворы, ён мусіць есці з асобнага посуду?***

— Заражэнне адбываецца фекальна-аральна. Сапраўды, часта пытаюць, ці жыве хелікабактар у поласці рота, ці можна праз пацалунак заразіцца. Хелікабактар можа знаходзіцца ў роце ў двух выпадках. Першы — калі бактэрыя трапіла туды нядаўна. Яна жыве ў кіслым асяроддзі, і чым яно больш кіслае ў страўніку, тым лепш яна сябе адчувае. У роце не кіслае асяроддзе, таму доўга яна там не знаходзіцца. Другі выпадак — калі адбываецца рэфлюкс. Пры запушчанай язве страўніка характэрныя адрыжка і закід змесціва страўніка ў стрававод.

Рэфлюкс небяспечны яшчэ вось чым. Калі ў страўніку кіслае асяроддзе, то ўжо ў дванаццаціперснай кішцы — шчолачнае. Але кожны ўчастак нашай стрававальнай сістэмы прызвычаіўся працаваць у сваім асяроддзі, і іншае яму не падыходзіць. Каб яны не змешваліся, у нас маюцца клапаны, якія знаходзяцца паміж страўнікам і дванаццаціперснай кішкой, страўнікам і стрававoдам, і яны перашкаджаюць зваротнаму выкіду. Таму рэфлюкс варта лячыць. Ён пагражае не толькі горыччу ў роце і дыспепсічным расстройствам. Калі гэта доўга працягваецца, могуць утварацца атыповыя клеткі і развіваецца рак. Калі надоўга прымаеце гарызантальнае становішча, у прыватнасці, перад сном, пажадана, каб страўнік быў пусты.

***— Ці ёсць генетычная схільнасць да заражэння хелікабактарам?***

— Імунітэту ад хелікабактара, на вялікі жаль, няма. І калі вынайдуць вакцыну, то мы зробім вялікі крок у лячэнні, а колькасць хворых будзе вельмі малая.

***— Як даведацца, што адбылося заражэнне, калі адсутнічаюць сімптомы?***

— Гастраэнтэролагі прапануюць розныя методыкі, пачынаючы ад тэста на дыханне, заканчваючы антыцеламі ў крыві і фібрагастраскапіяй. Калі звярнуцца да гастраэнтэролага, ён вызначыць найбольш падыходзячую для вас методыку.

***— Гастрыт — гэта пачатак язвы? Ці трэба яго лячыць?***

— Гэта запаленне слізістай страўніка, якое марудна развіваецца. Яно здараецца з-за названых мной прычын, у тым ліку хелікабактара і рэфлюксу. І калі гэты стан не лячыць, у далейшым ён вядзе да атрафіі слізістай страўніка. І потым мы выяўляем у гэтых месцах рак. Паводле некаторых аўтараў, 80—85 % выпадкаў раку страўніка выкліканы хелікабактарам. Усё пачынаецца з простага гастрыту, які не лечаць.

***— У чым заключаецца лячэнне?***

— Сённяшнія пратаколы лячэння прадугледжваюць прызначэнне інгібітараў пратонавай помпы — прэпаратаў, якія змяншаюць узровень кіслотнасці ў нашым страўніку для зніжэння агрэсіўнасці асяроддзя, што садзейнічае зажыўленню слізістай. Адначасова прызначаюцца антыбіётыкі і гастрапратэктары — яны ахоўваюць сценкі страўніка.



baiyun.ru

Многія здзіўляюцца, што мы камбінуем адначасова некалькі антыбіётыкаў. Праблема заключаецца ў тым, што сучасная ежа ўтрымлівае невялікую колькасць антыбіётыкаў. Яны трапляюць у наш страўнік праз мяса, калі жывёла хварэла, і яе лячылі. Часам антыбіётык дадаюць у якасці кансерванту. У выніку хелікабактар выпрацоўвае рэзістэнтнасць (устойлівасць), і прыходзіцца прызначаць некалькі прэпаратаў, каб яе знішчыць. Прыкладна кожныя 10 гадоў з'яўляецца новае пакаленне антыбіётыкаў, а рэзістэнтнасць бактэрыі выпрацоўваюць нашмат хутчэй, чым удаецца стварыць новы антыбактэрыяльны прэпарат.

***— Ці трэба падчас лячэння абмяжоўваць сябе ў нейкіх прадуктах?***

— Сучаснае лячэнне язвы страўніка не патрабуе вялікіх абмежаванняў. Пацыенты атрымліваюць гастрапратэктары і інгібітары пратонавай помпы, а сама ежа на лячэнне язвы страўніка не ўплывае. Канешне, не трэба есці ўсё запар, ніхто не адмяняў правілаў здаровага харчавання. Тут трэба памятаць, што наш страўнік любіць, калі мы прымаем ежу маленькімі порцыямі, але часта. Так выпрацоўваецца больш слізі і наш страўнік больш абаронены. Тут важна, не столькі *што* вы будзеце есці, а *як часта* і *колькі*.

***— Колькі часу звычайна займае лячэнне?***

— Для аблягчэння вострай фазы — у сярэднім два-тры тыдні з курсам антыбіётыкаў. Каб страўнік аднавіць, прыём інгібітараў пратонавай помпы працягваецца яшчэ пэўны час. Калі пасля лячэння адбываецца паўторнае заражэнне праз нейкі час, патрабуецца паўторнае лячэнне. Але гэта не сведчыць пра тое, што пярэднняе было неэфектыўнае.

***— Наколькі высокая верагоднасць знішчыць хелікабактар і вылечыць язву страўніка?***

— Нашы гастраэнтэролагі паспяхова лечаць язву страўніка і дванаццаціперснай кішкі. Калі своечасова звярнуцца да доктара, усё скончыцца добрым вынікам.

***— А калі язва доўга не зажывае?***

— Такое здараецца. Часам так маскіруецца рак. Таму калі язва доўга не зажывае, трэба праверыцца на рак страўніка. У нас, дарэчы, ён займае па распаўсюджанасці пятае месца сярод іншых анкалагічных хвароб.

***— У які момант варта звяртацца да ўрача, улічваючы, што праяў інфіцыравання хелікабактарам спачатку няма? Колькі часу праходзіць да з'яўлення сімптомаў?***

— Гэта вельмі індывідуальна. Як і з любым захворваннем, лепш праводзіць прафілактыку, а не чакаць прыступаў болю. Вызначыць наяўнасць хелікабактара пры сучасных лабараторных магчымасцях вельмі проста. Спачатку варта звярнуцца да гастраэнтэролага, каб ён ацаніў стан вашага страўніка і вызначыў, ці патрабуецца абследаванне і лячэнне. Не трэба баяцца і саромецца, не заўсёды ёсць патрэба ў глытанні «зонда». Як я казаў, наяўнасць хелікабактара можна вызначыць праз дыханне ці па аналізе крыві. Ды і сучасная фібрагастраскапія можа рабіцца пад седацыяй — гэта не наркоз, а сон. Калі вы адносіцеся да групы рызыкі, а гэта ўзрост 60+, жаночы пол і наяўнасць у сям'і раку страўніка, трэба правярацца.

***— Чаму перад планавай аперацыяй трэба рабіць ФГДС ці кансультавацца ў гастраэнтэролага?***

— Я казаў пра стрэсавую язву, якую можна атрымаць падчас працяглага і складанага лячэння. Часам урачу даводзіцца прызначаць нестэроідныя супрацьзапаленчыя прэпараты. Гэта група лекаў, якая змяншае выпрацоўку слізі слізістай страўніка. І калі мы ўжо маем праблему са страўнікам — вострую язву ці абвастрэнне гастрыту — дадалі стрэс і нестэроідныя супрацьзапаленчыя прэпараты, то можа ўзнікнуць страўнікавае кровацячэнне ці нават перфарацыя страўніка, калі змесціва трапляе ў брушную поласць.

***— Ці ўплываюць шкодныя звычкі на абвастрэнне язвы страўніка?***

— Алкаголь моцна не ўплывае на гэта захворванне, ён больш шкодзіць печані і падстраўнікавай залозе. А вось курэнне мае не прамое ўздзеянне, а ўскоснае. Цыгарэта звужае сасуды ва ўсім целе, і страўнік — не выключэнне. І калі звужаюцца сасуды слізістай, змяншаецца выпрацоўка слізі. Акрамя таго, за кошт згарання тытуню выпрацоўваюцца канцэрагены, мы іх глытаем і, такім чынам, паскараем шлях да раку страўніка. Курэнне пры язве — гэта двайны ўдар па здароўі.

ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ

ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ

Наш чалавек

## У СВАЁЙ ВЁСЦЫ, НА СВАЁЙ ЗЯМЛІ

**«Дзівак», — кажа хто-ніхто пра Аляксандра Ермаловіча і, здаецца, што мае рацыю. Ну сапраўды: у Аляксандра ёсць кватэра ў Мінску (падарунак бацькі), ёсць двухпакаёўка ў Беразіне, а жыве ён апошнім часам у звычайнай сялянскай хаце, у вёсцы Вязькуцін, дзе ні крамы табе, ні школы, ні клуба... А да ўсяго трымае на сваім падворку столькі жыўнасці...**

Пасля школы Аляксандр Ермаловіч не марыў пра начальніцкія партфелі ды белыя каўнерыкі. Спачатку падаўся ў будаўнікі — папрацаваў... Не спадабалася. Пайшоў на курсы трактарыстаў і потым, атрымаўшы «дыплом», вярнуўся да сябе на радзіму, стаў незаменным спецыялістам у мясцовай гаспадарцы. Ва ўсякім разе, ва ўмовах сёлетняй зімы з яе завеямі ды сумётамі без Аляксандра ды яго «Амкадора» тут дакладна спынілася б жыццё. А так...

Пад'ём у яго ў пяць гадзін раніцы, бо трэба ж дагледзець трох кароў, двух бычкоў, свіней, гусей, курэй, качак...

Уся гэтая гаспадарка — клопат у асноўным самога гаспадара: ён поіць, доіць і корміць... Заканамернае пытанне, чым?

— На час уборкі Саша штогод перасаджваецца на камбайн, — расказвае яго жонка Вольга. — І такім чынам зарабляе не толькі грошы, авяшчэ і зерне. Да таго ж ён сам засявае пустыя прысядзібныя ўчасткі, садзіць бульбу... У нас вырастае ўсё — толькі старайся. Да таго ж Саша — чалавек таварыскі, многіх выручае сам, многія, калі спатрэбіцца, выручаюць яго...

Іншае пытанне, навошта яму вось гэтак «шчыраваць»? Дзяцей жа не сямёра па лаўках?

У вёсцы, з бацькамі, і сапраўды, толькі двое школьнікаў. Большы сын ужо працуе, дачка жыве і вучыцца ў Італіі.

Дарэчы, тая сям'я, якая прымала дзяўчынку на аздараўленне, запрасіла неяк і яе бацьку — узяць адпачынак і па-сапраўднаму адпачыць.

Аляксандр не сказаць каб узрадаваўся, каб гэтага дужа хацеў, але ж на ўгаворы здаўся — махнуў у тую Італію. Казаў, што ў першыя дні ў ахвоту паляжаў на пляжы, пакатаўся на яхце, а ўжо ў наступныя...

— Лягу спаць і сніцца, што я не па моры плыву, а на камбайне па спелай збажыне. І так ад гэтага радасна, што прачнуся і адразу б, здаецца, дамоў. Не прывык я жыць у абдымках гультайства.

Прывык — у рабоце, у клопатах, у сваёй вёсцы, на сваёй зямлі.

**Ніна Бурко,**
*Бярэзінскі раён.*

Трэці ўзрост

## «ДЛЯ РАДАСЦІ ТРЭБА НЯШМАТ»

**Больш за 60 гадоў таму пры Асіповіцкай цэнтральнай раённай бальніцы быў створаны Савет ветэранаў. Як атрымалася аб'яднаць людзей і чаму ім, пажылым, так важна не адрывацца ад калектыву, весці актыўны спосаб жыцця, расказала яго старшыня Зінаіда Канстанцінаўна ПАЦКЕВІЧ.**



— Мы займаемся арганізацыяй вольнага часу нашых пенсіянераў, пішам біяграфіі ветэранаў вайны. За доўгія гады ўдалося апытаць каля 500 чалавек; інфармацыю пра кожнага, хто ваяваў, сабраць у асобныя адмысловыя папкі, якія ўражваюць усіх, хто цікавіцца работай Савета. Відаць, таму нас некалькі разоў запрашалі на рэспубліканскую канферэнцыю з удзелам прадстаўнікоў Германіі, дзе мы тройчы выйгравалі гранды.

Зрэшты, гэта ўзнагарода не адзіная ў Савета: хор ветэранаў двойчы атрымліваў «Залатыя ліры», а сама Зінаіда Канстанцінаўна — і таксама двойчы — была прызнана жанчынай года Магілёўскай вобласці.

— Было вельмі складана, — прызнаецца яна, — але мы знайшлі звесткі пра ўсіх нашых медыкаў, хто пайшоў на вайну і хто вярнуўся. Пра некага атрымалася менш інфармацыі, пра некага — больш, але ўшанаваны кожны. Гэта вельмі важна было зрабіць хоць бы таму, што з 85 чалавек цяпер застаўся толькі адзін... Увесь матэрыял я аб'яднала ў кнігу.

Такі вось, можна сказаць, асабісты клопат старшыні пра захаванне памяці цалкам зразумелы, калі ведаць, што свой лёс з бальніцай Зінаіда Канстанцінаўна звязала вельмі даўно, лічыце, у сярэдзіне мінулага стагоддзя.

— Мы раслі без бацькі, — успамінае жанчына. — Ён кінуў сям'ю адразу пасля вайны. А мама была ў партызанскім атрадзе, дзень і ноч працавала, каб пракарміць чацвярых дзяцей... Я скончыла школу першай і вельмі хацела пайсці ў медыцыну, паехаць вучыцца ў Бабруйск. Грошай на гэта ў мамы не было, а ў нас, у Асіповічах, якраз адкрываліся курсы медсёстраў. Я паступіла, стала старастам групы, пайшла працаваць, а з часам — нават выкладаць у вучэбна-вытворчым комплексе, рыхтаваць будучых медыцынскіх сёстраў. Многія з іх і сёння працуюць у бальніцы.

Ведае Зінаіда Канстанцінаўна і як падтрымаць тых, хто сышоў на пенсію.

— У нас вельмі папулярныя «Добрыя сустрэчы». Да пандэміі яны праходзілі кожны месяц. Работнікі бібліятэкі прапаноўвалі цікавую тэму, ветэраны бралі кнігі, чыталі, разам абмяркоўвалі, — тлумачыць Зінаіда Канстанцінаўна. — Не так даўно мы сталі арганізоўваць і гутаркі з сацыяльным псіхолагам. На кожную — яна прыносіць розныя тэсты, «прымушае» нас, пажылых, пра многае падумаць, прымераць на сябе... У цёплае надвор'е мы запрашаем ветэранаў у «Ціхі дом»: ладзім сустрэчы на свежым паветры, найчасцей — на ўчастку Марыі Маркаўны Фёдаравай. Таксама выбіраем тэмы для размоў, дзелімся думкамі.

— А вось вячоркі ў нас толькі вясёлыя! — хваліцца Зінаіда Канстанцінаўна. — Гатуем прысмакі, збіраемся, п'ём гарбату... Нават з-за пандэміі істотных збояў у рабоце Савета, здаецца, не было. Мы з Марыяй Маркаўнай рэгулярна тэлефануем нашым ветэранам, віншуем са святамі, пытаемся пра здароўе. Праўда, калі праведваем хворых, у дамыкватэры ў сувязі з пандэміяй ужо не заходзім: стараемся на вуліцы паразмаўляць з іх роднымі, але ж каб чалавек хоць у акенца бачыў, што да яго прыходзілі, што ён не забыты.

...Асіповічы — горад невялікі (30 тысяч чалавек насельніцтва), аднак Зінаіда Канстанцінаўна ўпэўнена, што магчымасцяў для актыўнага жыцця тут дастаткова. Галоўнае — не замыкацца ў чатырох сценах, сам-насам з тэлевізарам.

— Асобных ветэранаў мы проста выцягваем з дому — разам ходзім на канцэрты, у кіно. У кампаніі ж яно заўсёды цікавей... І людзі потым дзякуюць, што ўзялі іх з сабой, пытаюцца, калі наступны культпаход. Асабліва задаволеныя тыя, хто прыязджае з вёсак. Раніцай, напрыклад, яны да доктара, а потым да нас: тут і гарбаты пап'юць, і часопісы пагартаюць, і фотаздымкі паглядзяць. Іх у нас вельмі шмат: з кожнага мерапрыемства робім «справаздачы», пішам нататкі. Для радасці трэба няшмат.

І сапраўды...

**Віталія Крычэўская,**
*г. Асіповічы.*

Весткі з месцаў

## У КОЖНАГА БЫЛІ ТРЫ СПРАВЫ... І ўсе прыемныя!



**З чаго пачынаецца вясна? Вядома ж — з праводзін зімы. У нашым дзіцячым садку Масленіца — ці не самае вясёлае і чаканае свята, бо выхаванцы ведалі пра бліны, якія трэба есці на тыдні, пра пудзіла, якое трэба спальваць... Аднак ведаць — адно, а вось пабачыць ды яшчэ і прычыніцца...**

Некалькі дзён дзеці рыхтаваліся да гэтай падзеі, з нецярпеннем чакалі яе. На занятках паслухалі, як раней праводзілі зіму, і добра запомнілі, што на Масленіцу кожны мае тры справы: з горак катацца, бліноў наядацца, з зімой развітацца... Іншымі словамі — весела і разам з дзецьмі праводзіць час: вадзіць карагоды, спяваць, спаборнічаць у смеласці і знаходлівасці, сіле і спрыце, смяяцца з жартаў скамарохаў, і нарэшце — есці духмяныя блінкі.

**Алеся Медвядзюк,**
**выхавацель Крытышынскага дзіцячага садка,**
*Іванаўскі раён.*

Год народнага адзінства

## КАЛІ ЎСЕ ЯК АДЗІН...

**З раніцы 22 чэрвеня 1941 года мая вёскі Калавуравічы, што на Піншчыне, жыла звычайнымі клопатамі: соладка спалі дзеці, завіхаліся каля печаў гаспадыні, спяшаліся па справах гаспадары, на лузе пасвіўся статак кароў... А што недзе выбухі, дык гэта, можа, вучэнні?.. Аднак пад вечар да людзей ужо даляцела страшная вестка: вайна!**

Гэтае адно кароткае слова перавярнула ўсё ўсталяванае вякамі жыццё. Праз некалькі дзён у суседняй вёсцы ўжо стаяла нямецкая камендатура, а ў нашых суседзяў пасяліўся нямецкі фельчар. Баязлівы і дурнаваты, ён трымаў на павадку двух сабак, кідаў ім костку, глядзеў, як грызуцца, і рагатаў: «Дас іст Сталін, дас іст Гітлер».

А непадалёк у ровенскіх лясах Украіны (гэта напраскі кіламетраў з дзесяць) ужо дзейнічалі народныя мсціўцы, ішлі ў партызанскія атрады і мае аднавяскоўцы. Яны пускалі пад адхон варожыя саставы, руйнавалі масты, грамілі гарнізоны — дзейнічалі ў вельмі цяжкіх умовах.

...Цяпер ужо не дазнаешся, чыя — канкрэтна — гэта была ідэя, але нашы мужчыны «пастанавілі», што для партызанаў у кожнай хаце (вёска была працавітая і досыць заможная) па чарзе будзе пячыся хлеб, перапраўляцца палатно ды іншае неабходнае.

Усё сабранае чарговы гаспадар складваў на воз, накрываў посцілкай, а тую — сенам, травой ці дровамі (каб вораг не здагадаўся) і глухімі ляснымі сцежкамі адвозіў партызанам. Такім чынам усе чатыры гады вяскоўцы дзяліліся з імі ежай, вопраткай, абуткам, жанчыны вязалі шкарпэткі і рукавіцы...

Спытаеце, у чым была еднасць? Па словах радні, у тым, што ўся вёска стала як бы адной сям'ёй. І самае галоўнае, што ніхто, ні адзін чалавек, ні разу не здрадзіў, не данёс на сваіх аднавяскоўцаў.

Як не было і таго, каб збілася чарга, каб нехта адмовіўся ад рызыкоўнай дастаўкі. Гэта была сапраўдная еднасць, шчырая адданасць Радзіме!

**Ніна Горгуль,**
*г. Мінск.*

Па-чалавечы

## Нечаканая дапамога

**...Мой тата недзе пасля васьмідзесяці стаў цяжка хварэць. Дзень пры дні ён ляжаў на ложку, а калі рабілася хоць трохі лягчэй, памаленьку ўставаў, сунуўся ў хлеў — выводзіў на траву свайго любімага Орліка.**

Вось і ў той раз з цяжкасцю дабрыў да каня, адвязаў яго, хацеў быў надзець аброць і не змог — страціў прытомнасць...

Ачуняў, здаецца, ад холаду, які залазіў яму за каўнер, у вушы, у рукавы... А захацеў падняцца з зямлі — і не здолеў, як ні спрабаваў...

На дапамогу таксама нікога не клікаў — сэнсу не мела, бо дома — ніводнай жывой душы, толькі Орлік, які раптам апусціў галаву, цяплом задыхаў у твар...

Тата расплюшчыў вочы, скарчэлымі ад холаду пальцамі ўхапіўся за грыву і павалі ўстаў.

...Яны сябравалі — мой тата і Орлік.

**Іван Букоўскі,**
*Глыбоцкі раён.*

**Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.**